# Вялікая традыцыя, вялікая гісторыя

## Нацыянальны гістарычны музей стаў асноўным арганізатарам І Рэспубліканскага краязнаўчага форуму Беларусі, які праходзіў там 12–13 сакавіка

Падобныя ініцыятывы ажыццяўляліся й дагэтуль. Але ў такім фармаце форум ладзіўся ўпершыню, і яго арганізатары ставілі на мэце паяднаць краязнаўцаў з розных куткоў Бацькаўшчыны. У Гістарычным сабраліся тыя, хто нібы адкрывае Беларусь наноў ды хацеў бы расказаць пра свае краязнаўчыя праекты.

У вітальным слове старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы й культуры Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, доктар гістарычных навук Ігар Марзалюк заклікаў беларусаў пазбаўляцца комплексаў мізэрнасці й правінцыйнасці ды памятаць, што “за нашымі плячыма — вялікая традыцыя, вялікая гісторыя, і кожны з нас мусіць яе любіць, шанаваць і тыражаваць веды пра яе”. Сапраўды, не кожны музейны супрацоўнік, гісторык ці навуковец захоча збіраць гістарычныя факты й праводзіць даследаванні, каб даказаць усяму свету, што маленькая вёсачка, раённы горад, у якім ён жыве й працуе,— значная гістарычная, культурная й турыстычная мясціна. І мала хто нават здагадваецца, што гэта сапраўды так. Нездарма ў беларускай глыбінцы па сёння стаяць палацы, касцёлы й цэрквы, якія здзіўляюць веліччу пасярод вясковага пейзажу. Чым не сведчанне, што будаваліся яны ў даўнія часы ў шматлюдных месцах, не меншых па значнасці, чым сучасныя індустрыяльныя гарады.

Краязнаўчы форум быў прымеркаваны да Трохгоддзя малой радзімы. Многіх з краязнаўцаў, якія прыехалі ў Мінск, менавіта любоў да “малой радзімы”, дзе яны нарадзіліся, падштурхоўвае складаць пра яе кнігі, рабіць навуковыя адкрыцці. У часе форуму ўшанавалі лаўрэатаў і пераможцаў конкурсу краязнаўчай літаратуры за 2017–19 гады. Усе 200 прац, дасланыя на конкурс, прадстаўлены былі на выставе ў музеі. Былі намінацыі, прысвечаныя Трохгоддзю малой радзімы, 75-годдзю Вялікай Перамогі, “Мой род, мая краіна” ды іншыя. Журы конкурсу адзначыла дыпломамі некалькі дзясяткаў чалавек, а таксама ўстановы культуры, адукацыі, інфармацыі ды навукі. Гран-пры конкурсу атрымаў вядомы ўраджэнец Пастаў Ігар Пракаповіч: пісьменнік, географ, краязнаўца, педагог. Ён напісаў каля 45 кніг на краязнаўчыя тэмы. А ў намінацыі “Краязнаўства рэгіёнаў Беларусі” перамагла кніга Алеся Зайкі “Крыніцы і вытокі: нарысы з гісторыі ды культуры Івацэвіччыны. Да 500-годдзя горада Івацэвічы”. Дыплом быў уручаны рэдактару кнігі Валерыю Гапееву.




**Ганаровыя ўдзельнікі Форуму краязнаўцаў**

Міністэрства інфармацыі, з падтрымкай якога праходзіў форум, таксама вызначыла сваіх пераможцаў. За значны ўнёсак у развіццё й папулярызацыю беларускай краязнаўчай літаратуры Ганаровай граматай Міністэрства ўшанаваны краязнаўцы Валеры Мароз, Анатоль Бензярук, Анатоль Гладышчук і Леанід Несцярчук.

У часе працы секцый форуму гаварылася пра экалагічнае краязнаўства й турыстычную дзейнасць, а таксама пра яго месца ў сістэме навукова-даследчай працы, узгадваліся біяграфіі асоб, якія шмат зрабілі для развіцця айчыннага краязнаўства. Форум сабраў і дзве канферэнцыі: студэнцкую “Моладзь і краязнаўства” ды школьнікаў “Пазашкольнае краязнаўства: досвед рэгіёнаў”. Па выніках працы секцый выйдзе зборнік у электронным і друкаваным выглядзе, які атрымае кожны ўдзельнік. Выданне паступіць у Рэспубліканскі цэнтр экалогіі ды краязнаўства, на кафедру падрыхтоўкі краязнаўцаў Беларускага дзяржпедуніверсітэта імя Максіма Танка, у Беларускі дзяржуніверсітэт культуры й мастацтваў, бібліятэкі й музеі ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

Напрыканцы форуму большасць краязнаўцаў выказала жаданне стварыць у краіне краязнаўчае таварыства, выдаць “Энцыклапедыю краязнаўцаў Беларусі”. Форумы збіраюцца ладзіць і надалей, запрашаць на іх будуць як беларускіх, так і замежных краязнаўцаў, а таксама беларусаў замежжа, якія цікавяцца родным краем.

Акрамя Гістарычнага музея, у ліку арганізатараў форуму краязнаўцаў — Беларускі фонд культуры, Нацыянальная бібліятэка, Выдавецкі дом “Звязда”, Саюз пісьменнікаў Беларусі. Падтрымлівалі праект міністэрствы інфармацыі ды культуры.

**Ганна Лагун**